Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1(82), 2014

*УДК 398.3(=161.3):115*

# Катэгорыя часу ў прыкметах і павер'ях беларусаў

А.А. Кастрыца

У артыкуле аўтар звяртаецца да катэгорыі часу ў прыкметах і павер'ях беларусаў, разглядае яе тэматычную і функцыянальна-семантычную складаючыя, вызначае спецыфічныя рысы асэнсавання часу ў традыцыйнай культуры жыхароў Гомельшчыны.
**Ключавыя словы**: прыкмета, павер'е, сезон, катэгорыя часу, каляндарнае свята, часавыя адзінкі.

In the article the author addresses to the category of time in signs and beliefs of Byelorussians, considers its thematic and functional-semantic components and defines peculiar features of judgment of time in traditional culture of inhabitants of Gomel region.
**Keywords**: a sign, belief, a season, time category, a calendar holiday, time units.

Час, бясспрэчна, з'яўляецца адной з асноўных катэгорый традыцыйнай карціны свету, важнай складаючай чалавечага існавання і ўніверсальнай формай арганізацыі быцця, базавым паняццем у фальклорыстыцы, псіхалінгвістыцы, лінгвакультуралогіі, філасофіі. У дадзеным артыкуле мы звярнуліся да тэматычнай і функцыянальна-семантычнай складаючых катэгорыі часу, да вызначэння спецыфічных рыс асэнсавання часу ў традыцыйнай культуры беларусаў. Фактычным матэрыялам для правядзення даследавання паслужылі прыкметы і павер'і беларусаў, зафіксаваныя на тэрыторыі Гомельскай вобласці.

У дачыненні да мадэлі свету прынята гаварыць аб часе абсалютным (міфалагічным), адносным (цыклічным прыродным) і жыццёвым (чалавечым). Сярод часавых адзінак, прадстаўленых у прыкметах і павер'ях Гомельшчыны, варта выдзеліць наступныя: сезоны (поры года), месяцы і прымеркаваныя да іх святочныя дні народнага каляндара, дні тыдня, час сутак.

Сезонны час, зімовы, веснавы, летні і асенні, і ўсе каляндарныя святочныя дні ў прыкметах і павер'ях беларусаў маюць свае каштоўнасныя характарыстыкі (спрыяльны / неспрыяльны, добры / нядобры, бяспечны / небяспечны, станоўчы / адмоўны), якія яны атрымалі ў адпаведнасці з уплывам на ход гаспадарчага і асабістага жыцця чалавека.

Зімні сезон прадстаўлены ў прыкметах і павер'ях Гомельшчыны снежнем, студзенем і звязанымі з імі святочнымі днямі народнага календара, згадак пра люты амаль не сустракаецца. Так, снежань і адпаведна Піліпаўка традыцыйна лічацца няўдалымі для наладжвання асабістага жыцця («На Піліпаўскі пост *нельга* было *жаніцца.* Шчыталася, што *разайдуцца*» (запісана ў в. Аздзеліна Гомельскага р-на ад Кліменка Г.Ф., 1943 г.н.); «Свадзьбу можна гуляць толькі не ў пост (удовам можна) і не на Піліпаўку, бо *будуць маладыя на друг друга выць усю жызнь*» (запісана ў в. Старое Сяло Веткаўскага р-на ад Мацюковай Н. Д., 1930 г.н.)), аднак добрымі для прагназавання надвор'я («Калі Піліпаўка *снежная*, дык *май* будзе *мокрым*»; «Калі да піліпаўскіх запускоў мянтуз памеча ікру, то зіма закончыцца хутка, а *вясна будзе ранняй*» (запісана ў в. Антонаўка Добрушскага р-на ад Чмыровай А.Я., 1939 г.н.)) і будучага ўраджаю («Калі на Піліпаўку іней – будзе *ўраджай на авёс*» (запісана ў в. Пакалюбічы Гомельскага р-на ад Грыбанавай Н.У., 1935 г.н.)).

Студзень і Каляды – часавы перыяд, які нясе ў сабе ідэю пачатковага (першага), а значыць, даволі важнага для будучага, гэта перыяд, у які, па сутнасці, закладваюцца асновы для ўдалага новага года. Менавіта ў святыя калядныя дні (Раство, Новы год, Вадохрышча) нашы продкі

прагназавалі ўраджай («Калі днём пагода добрая *на Ражаство* – гэта будзе *неўражайны год*, галодны, а калі снег падае – летам будзе багаты *уражай*» (запісана ў в. Шарсцін Веткаўскага р-на ад Ганчаровай Е.Я., 1919 г., Лосевай В.Я., 1918 г. н.)) і змены ў надвор'і і прыродзе («Еслі *на Новы год* сільны мароз, то летам сільна *сонца будзе [пекці]*)»

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(запісана ў в. Старое Сяло Веткаўскага р-на ад Мацюковай Н. Д., 1930 г.н.); «Калі *на Хрышчэнне* поўная луна – вясной будзе вялікі разліў рэк» (запісана ў г.п. Лоеў ад Жураўскай К.Я., 1938 г.н.));

правакавалі дабрабыт у гаспадарцы («*На Стары Новы* год раніцай моладзь хадзіла засявала. Раскідвалі зярно па падлозе, разбіваў хазяін гарбуз – усё для таго, *каб багата жылося*» (запісана ў в. Івольск Буда-Кашалёўскага р-на ад Мартынавай Г.І., 1932 г.н.)), добры ўраджай («На куццю *перад Крашчэннем*, каб добры ўраджай быў, па хатах хадзілі засявальнікі – пажылыя мужчыны. Яны сыпалі ў хаце зерне крыжом з вугла ў вугал і казалі: «Сеем, пасяваем, дабра хазяевам жалаем». Ета рабілася, *каб украпіць ураджай*» (запісана ў в. Салтанава Рэчыцкага р-на ад Грабцэвіч М.К., 1920 г.н.); «*На Крашчэнне* ідуць у царкву, і кожны гаспадар стараецца прыйсці рано – *ураджай збярэ першым*» (запісана ў в. Старая Дуброва Акцябрскага р-на ад Краўчанка А.М., 1927 г.н.)) і здароўе («Калі хата *на Крашчэнне* чыстая, сям'я будзе ўвесь год *здаровая*» (запісана ў в. Сінічына Буда-Кашалёўскага р-на ад Васілеўскай М.А., 1930 г.н.)).

У гэты ж часавы перыяд нашы продкі таксама прытрымліваліся пэўных правілаў паводзін і забарон, такім чынам захоўваючы сябе ад шкоднага ўздзеяння навакольнага свету і яго прадстаўнікоў: «*На Рождзяство* хазяін *не* доўжан *выходзіць з хаты*, штоб не падохлі яго авечкі» (запісана ў в. Прысно Веткаўскага р-на ад Шкляровай Н.І, 1930 г.н.); «*На Новы год расчосвацца нельга*, бо будуць куры грады разграбаць. *6–7 студзеня* таксама нельга расчосвацца» (запісана ў г. Гомель ад Кавалёвай А.Н., 1932 г.н., перасяленкі з в. Задуб'е Кармянскага р-на); «*Калядныя дні* – гэта святыя дні, таму *нельга* было *шыць,* нешта *мыць, звязваць, плясці*. *Нельга* было *ругацца*, бо тады будзеш ругацца ўвесь год» (запісана ў в. Сінічына Буда-Кашалёўскага р-на ад Васілеўскай М.А., 1930 г.н.)).

Сезон вясны (сакавік, красавік, май; каляндарныя святы (Гуканне вясны, Саракі, Дабравешчанне, Вербніца, Вялікдзень, Юр'е, Тройца і інш.)) адлюстроўваецца ў тэкстах прыкмет і павер'яў як вельмі спрыяльны і арыентаўны на будучыню час, як пачатак новага гаспадарчага года і актыўных дзеянняў ахоўна-ачышчальнага, ініцыяльнага і прадуцыравальнага характару. Вясной можна

знайсці цудадзейныя лекавя сродкі і паспрыяць здароўю на ўвесь наступны год («У гэты дзень [на *Гуканне вясны*] выпякалі «*хрэшчыкі*», імі можна было вылечвацца *ад хвароб* [2, с. 105]; «Перад самой Пасхай, у *Чысты чацвер*, хадзілі мыцца *ў баню*. Хадзілі *да ўсхода сонца*, штоб не было нічога на целе (балявак)» (запісана ў в. Брылёва Гомельскага р-на ад Гарбузавай М.Я., 1929 г.н., перасяленкі з в.Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на); «*На Юр'я ўранні* ўстаеш і бяжыш *бегаць па расе*, каб *быць здаровым* або бягіш у поле качацца па жыту, таксама, каб не балець» (запісна ў в. Галавінцы Гомельскага р-на ад Рудзянковай М.М., 1927 г.н.));

зрабіць усё магчымае для паляпшэння знешняга выгляду («Дзяўчаты *утрам* [*на Вялікдзень*] мыліся яйкам, каб быць *прыгожымі*» (запісана ў в. Каплічы Калінкавіцкага р-на); «[На *Гуканне вясны*] дзяўчаты адразалі валасы з хваста каровы і прыкладвалі іх да галавы з надзеяй, што *каса вырасце* даўжынёй з хвост каровы» [2, с. 105]);

«прыдбаць» добрага жаніха («Маладыя дзеўкі пачыналі з *Чыстага чацвярга* не есць. І не даўжна была есць тры дні, пакуль паскі не пасвецяцца. Эта штоб харошага *жаніха вычацвергаваць*» (запісана ў п. Станкі Веткаўскага р-на ад Воінавай Г. П., 1921 г.н.); [На *Гуканне вясны*] курам павязвалі прыгожыя стужкі, каб *прыгожы жаніх* здарыўся» [2, с. 105]);

забяспечыць добры ўраджай («З пасвяцоных *на Вялікдзень* яец скарлупкі клалі ў мяшочак, каб з вясны, перад тым, як сеяць, закапвалі ў зямлю, каб *ураджай добры* быў» [2, с. 118]), дабрабыт у гаспадарцы («Хто на *Юр'я* расу збірае, у таго карова дасць *багата малака*» (запісана ў в. Вуглы Рагачоўскага р-на ад Атрохавай В.Ф., 1930 г.н.)) і багацце («Існавала прыкмета, што калі харошы стол на *Тройцу*, то будзе хватаць усяго, увесь год *добра будзеш жыць*» [2, с. 145]);

засцерагчыся ад неспрыяльнага ўздзеяння навакольнага свету («Вярбу свяцілі на *Вербную нядзелю*, ставілі ў хляве пад стрэху, на прыпечку лажылі *ад гразы*» (запісана ў в. Старая Лутава Лоеўскага р-на ад удзельніц фальклорнага гурта «Лутава»)»; «На *Святога Егор'я* абсыпаюць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жывёлу макам, свецяць вярбой, як у поле выганяюць. Эта ўсё дзелаюць *ад ведзьмаў*» (запісана ў г. Добруш ад Грамыка Г.С., 1929 г.н.); «На *Тройцу* галінкі ліпы ўтыкалі ў абразы, у калітку, на заборы, над дзвярамі – *ад нячыстай сілы*, каб у хазяйстве была ўдача» [2, с. 140];

прадказаць надвор'е («Калі на *Сօракі* было марозна, то вясной яшчэ ждуць сорак маразоў» [2, с. 108]; «Якая пагода была на *Благавешчанне*, такая далжна быць пагода і на Пасху» (запісана ў в. Вуглы Рагачоўскага р-на ад Атрохавай В.М., 1930 г.н.); «Было такое павер'е, што як на *Пасху* будзе холадна, то і лето будзе халоднае, а як будзе цёпла, то і лето будзе цёплае» [2, с. 118]; «Сколько дней до *Благовещения* холодно, столько дней и после Благовещения будет холодно. Сколько дней до Благовещения тепло, столько дней и после Благовещения будет тепло» (запісана ў г. Гомель ад Кавалёвай Таццяны Нікіфараўны, 1932 г.н., Кавалёвай Анастасіі Нікіфараўны, 1935 г.н., перасяленак з в. Задуб'е Кармянскага р-на)).

Такім чынам, у адрозненне ад зімовага часу, які ў большасці сваёй прадстаўлены правіламі, забаронамі, прыкметамі-прагнозамі, веснавы час адрозніваецца яскрава выражаным дзейсным пачаткам і адпаведна прадстаўлены вялікай колькасцю дзеянняў, як магічных, так і рэальных, і звязаных з імі разнастайных павер'яў.

Летні перыяд, безумоўна, час росквіту прыроднага і чалавечага, час рэалізацыі мар і жаданняў, час адмены некаторых табу. Менавіта таму летам можна было знайсці шчасце і багацце, як духоўнае, так і матэрыяльнае («*Купальскую ноч* вельмі ждалі дзеўкі, бо верылі, шо она прынясе ім *шчасце*» (запісанаі ў в. Прыбалавічы Лельчыцкага р-на ад Акуліч Г.М. ); «Папараць-кветка зацвітае раз у год – *на Купалле*. Кветка цвіце толькі некалькі мінут. Калі чалавек зможа сарваць гэтую кветку, то ён стане вельмі *багаты і шчаслівы* і зможа адразу адшукаць клад» (запісана ў в. Сяменча Жыткавіцкага р-на ад Чарнагаловай П.П., 1927 г.н.); «Калі якая дзяўчына сабіралася замуж у гэтую восень, уставала раней усіх *падчас зажынак,* ішла на поле і зажынала на кожнай паласе хай па некалькі калоссяў, каб *жаніх меў многа добрых якасцей*» (запісана ў г .Добруш)) ; забяспечыць сябе лекавымі раслінамі і здароўем на ўвесь год («Зелле рвуць *на Івана Купалу*, па ягады ходзяць ад жывата. Кажуць, еслі нарвеш травы на Івана Купалу, то *лячэбная вельмі*» (запісана ў г. Мазыр); «Мы спецыяльна хадзілі ў лес у гэты дзень [*на Купалу*], сабіралі розныя травы. Гаварылі, у гэты дзень травы набывалі самую бальшую *цэлебную сілу*» (запісана ў в. Старое Сяло Веткаўскага р-на ад Васільцовай М.С., 1925 г.н.); «*Купальскую* расу збіралі *да ўсходу сонца*, каб ёй умывацца таму, у каго прышчы, пятна на целе, *для ачышчэння кожы*. У каго *балела спіна*, той *качаўся* па купальскай расе» (запісана ў в. Салтанава Рэчыцкага р-на ад Кляцоўскай М.І., 1935 г.н.)).

У гэты ж часавы прамежак імкнуліся атрымаць не толькі інфармацыю аб ураджаі ўжо пасеяных сельскагасападарчых культур («Сільная раса *на Івана* – к уражаю гуркоў» (запісана ў г. Добруш ад Грамыка Г.С., 1929 г.н.); «Калі *на Іллю* пойдзе дождж, то жыта ўрадзіць добрае» (запісана ў г.п. Лоеў ад Паўлюшчанка А.С, 1925 г.н, Бецікавай М.А., 1941 г.н.); «*На святога Пятра* дождж – ураджай дрэнны, два дажджы – добры, тры – багаты» (запісана ў г. Хойнікі ад Гарадзейчык Н.У., 1929 г.н.)), але і атрымаць багаты ўраджай, зберагчы яго («*На зажынках* пачынала работу абязацельна ўзрослая жанчына, а не дзеўка, штоб жыта было добрае, крэпкае, штоб добра радзіла на другі год» (запісана ў в. Агародня Добрушскага р-на)).

Восень прадстаўлена ў прыкметах і павер'ях Гомельшчыны ў асноўным Здвіжаннем, Пакровам і Дзядамі, падчас якіх можна было ў асноўным прагназаваць надвор'е («Старыя людзі счыталі, што калі *на Пакрова снег не пакрые* зямлю, то і *на Каляды не будзе снегу*» [2, с. 163]) і аддаваць даніну павагі памерлым («*На Дзяды* гатавалі многа разнай яды, а яшчэ гатавалі тую яду, якую любіў памёршы. Калі што падала са сталу, то гэта не падымалі, бо счыталі, што гэтым памёршыя пакарыстаюцца» [2, с. 163]). Гэтыя асаблівасці ўспрымання асенняга часу звязаны са зменамі ў прыродзе, з яе згасаннем-сном і адпаведна са зніжэннем актыўнасці самога чалавека.

У межах летне-асенняй сезоннай групы на Гомельшчыне зафіксавана *вялікая колькасць забарон* («*Да Спасу* няльзя яблакі есці, асобенна ў каго дзіцятка памерла» (запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на)»; «Пасля Іллі нельзя было купацца» (запісана ў г.п. Лоеў); «На Успенне нікому нельзя адказаць: усім, хто заходзіць у хату, трэба даць выпіць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гарэлкі і закусіць» [3, с. 393]), а таксама *павер'яў апатрапеічнага характару* («На варотах хлява вешалі ці калочкі, ці крапіву. Гэта каб ведзьмары не заходзілі ў хлеў, бо *на Івана* ведзьмары забіраюць у кароў малако» (запісана ў в. Каплічы Калінкавіцкага р-на ад Бабрэнка Г.М., 1938 г.н.); «*На Купалу* купаліся толькі ўдзень, бо баяліся ўноч купацца і лічылі, што можа ўцегці нячысцік» [2, с. 151]; «Кажуць, што *на Іллю* ўсе нячысцікі ператвараюцца ў розных звяроў: ваўкоў, лісіц, сабак, зайцоў. Паетаму ў еты дзень не пускалі ў хату катоў і сабак, каб не навялі на жыллё маланку» [2, с. 158]; «Першы спас – *Макавей*. У гэты дзень у царкве свяцілі мак. Свячоны мак должэн быў быць у кожнай хаце, бо ён быў для ахраны чалавека ад злых людзей, ад зглазу, нячысцікаў» (запісана ў г.п. Лоеў ад Паўлюшчанка А.С., 1925 г.н, Бецікавай М.А., 1941 г.н.); «[*На Здвіжанне*] у дварэ кідалі крапіву, дзе ходзіць скаціна. Вакруг хаты абкідвалі ад врагоў» [1, с. 191].

Як бачым, летне-асанні сезон ў прыкметах і павер'ях Гомельшчыны прадстаўлены ліпенем, жніўнем, вераснем і кастрычнікам і звязанымі з імі святочнымі днямі народнага календара, згадак пра чэрвень і лістапад амаль не сустракаецца.

Трэба адзначыць, што амаль ва ўсіх тэкстах прадказальнага характару узгадваюцца такія часавыя прамежкі, як вечар або ноч («*Увечары* глядзіш, ці ё на небе зоры. Тады грыбоў будзе багата. Еслі на первую, то первыя грыбы. Еслі на втарую неба такое хмарнае, цёмнае – не будзе грыбоў. А на трэцюю – не будзе ўсё лета грыбоў» (запісана ў в. Марс Лоеўскага р-на ад Нямлей В.І., 1928 г.н.); «На Іванаву *ноч* звёздна – многа грыбоў будзе» (запісана ў г. Добруш)), у тэкстах жа правакавальнага (прагнастычнага) характару – раніца, дзень («Каляды. *У эты дзень* усе ў сям'і стараліся ўстаць *раней*. Лічылі, што тады ўвесь год чалавек будзе падвіжны, бодры» (запісана ў г. Светлагорск ад Стомы З.Р., 1931 г.н.); «*На Вялікдзень раніцою*, як толькі ўстаў, трэба памуцца той вадою. У якую пакладзена чырвонае яйка. Гэта каб заўсёды быць румяным» (запісана ў в. Каплічы Калінкавіцкага р-на); «*На Івана* жанчыны ішлі *раніцай* рваць травы, ягады» (запісана ў г.п. Акцябрскі)). І гэта невыпадкова: інфармацыя, якая, паводле народных уяўленняў, прыходзіць ад прадстаўнікоў звышнатуральнага свету, можа быць атрымана толькі ў сітуацыі таямнічасці (цемры, цішыні, панавання звышсіл, небяспечнасці) і ўдзел звычайнага чалавека тут мінімізіраваны (ён толькі атрымлівае і расшыфроўвае інфармацыю); дзеянні прагнастычнага характару, здзяйсняемыя самім чалавекам, абсалютна рэальныя, а таму асвечаныя сітуацыяй пэўнай адкрытасці, г.зн. сітуацыяй свету раніцы і дня.

Відавочна, што катэгорыя часу шматаспектная і даволі разнастайная: яна змяшчае ўяўленні аб розных баках існавання навакольнага свету і асаблівасцях жыцця чалавека, духоўнага і матэрыяльнага, знешняга і ўнутранага, адрозніваецца вялікай колькасцю інтэрпрэтацый, якія знаходзяць сваё адлюстраванне ў фальклорных тэкстах. Усе адзінкі часу, згаданыя ў тэкстах прыкмет і павер'яў Гомельшчыны, з'яўляюцца, паводле народных вераванняў, сакральнымі і валодаюць магічнай сілай, а значыць, уплываюць на ўвесь ход жыцця чалавека-гаспадара.

**Літаратура**

1. Лоеўшчына... Бэзавы рай, песенны край: сучасны стан традыцыйнай культуры Лоеўшчыны / укладанне і сістэматызацыя В.С. Новак. – Гомель : Сож, 2007. – 472 с.

2. Прыкметы і павер'і Гомельшчыны / уклад., сістэм., тэксталагічная праца, уступныя артыкулы В.С. Новак, А.А. Кастрыца. – Гомель : Барк, 2007. – 224 с.

3. Святло каштоўнасцей духоўных. Жлобінскі край: мінулае і сучаснасць / пад агульнай рэдакцыяй В.С. Новак, А.А. Станкевіч. – Гомель : ААТ «Палеспечать», 2009. – 544 с.

Выкарыстаны матэрыял фальклорнага архіва кафедры беларускай культуры і фальклcarыстыкі ГДУ імя Ф. Скарыны

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 08.01.2014

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ